# Каб унікальныя помнікі былі на радзіме

Нядаўна падпісанае рашэнне савета фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы культуры і мастацтва, згодна з якім Міністэрству культуры ў 2020 г. са сродкаў фонду будуць выдзеленыя больш за 3 млн рублёў. Грошы мяркуецца накіраваць на розныя патрэбы, звязаныя з захаваннем і вяртаннем культурнай спадчыны краіны. Сярод гэтых мэтаў – папаўненне фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі комплексам рукапісных і друкаваных кніжных помнікаў.

Гаворка ідзе пра вельмі дарагія і асабліва каштоўныя асобнікі. Гэта, напрыклад, адно з прыжыццёвых выданняў Мялеція Сматрыцкага. Наколькі нам вядома, яго аўтарскіх і прыжыццёвых выданняў у краіне не захавалася, хоць ён быў аўтарам шэрагу літаратурных і багаслоўскіх твораў. Сярод набываемых рарытэтаў – надзвычай каштоўны рукапіс татараў Беларусі – хамаіл, напісаны на беларуска-польскай мове арабскімі літарамі. Таксама бібліятэка атрымае комплекс архіўных дакументаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Абсалютна ўнікальнымі з'яўляюцца прывілей і грамата каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх – Жыгімонта Вазы і Уладзіслава IV, якія кіравалі нашай дзяржавай у канцы XVI – пачатку XVII стагоддзя. Адзін дакумент на паперы, другі – на пергаменце. Адзін на лацінскай мове, другі – на старабеларускай. Дакументаў за подпісам і з каралеўскай пячаткай у нас захавалася вельмі мала, таму гэта матэрыялы сапраўды выключнага значэння.


nitatis Ecclesiastica, adinstar aliarum E
muniri iussimus. Datum In Conuentu V
Tryzna Præpositus Trocen Notarius & Re
loci ordinary factam, ac ipsas lras præinsert
firmitatis obtinere debere. Quoniam ne
Vilnen sitt definimus. Quibus quidem a
fundis, ædificys & subditis attinentys
Coniugum subscripto dedata Anno præsen
uolumusq ut robur debitum temporibus
Anno Dni MDCXXXIII Regnorum nos

Сёння ўзнікла рэдкая магчымасць набыць комплекс кніжных помнікаў, у якіх зафіксаванае наша мінулае. Дакументы маюць выключную гістарычную, культурную, матэрыяльную каштоўнасць. Варта адзначыць і сацыяльную значнасць гэтага набыцця. Дэманстрацыя ўнікальных дакументаў у Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі будзе спрыяць развіццю патрыятызму, любові да Айчыны і шанаванню продкаў.

*Паводле паведамлення НББ*